# Інтэрактыўныя метады навучання

Нядаўна на базе гімназіі № 14 горада Мінска праўшлі інтэрактыўныя заняткі настаўнікаў хіміі ў рамках арганізаванага павышэння кваліфікацыі па тэме “Рэалізацыя зместу і сучасных методычных падходаў у выкладанні вучэбных прадметаў”.

Інтэрактыўнае навучанне - гэта спецыяльная форма арганізацыі пазнавальнай дзейнасці, пры якой практычна ўсе навучэнцы аказваюцца ўцягнутымі ў працэс пазнання, пры гэтым адбываецца шырокае ўзаемадзеянне ўдзельнікаў заняткаў не толькі з выкладчыкам, але і адзін з адным.

Выкарыстанне інтэрактыўных метадаў навучання ў дзейнасці педагога - гэта важны і адказны крок, які патрабуе вялікіх эмацыйных выдаткаў, творчасці, высокай ступені эрудыраванасці і гатоўнасці да пастаянных змен. Важна змяніць працэс ўзаемадзеяння паміж настаўнікам і вучнем: актыўнасць настаўніка павінна саступіць месца актыўнасці навучэнца, а галоўная задача настаўніка - стварыць умовы для ініцыятывы сваіх вучняў. Такім чынам, выкарыстанне дадзенага метаду - гэта адзін са спосабаў раскрыцця здольнасцяў, развіцця самастойнасці і самаарганізацыі вучняў, а так жа ўмення весці дыялог, шукаць і знаходзіць змястоўныя кампрамісы, рабіць высновы.

Настаўнікі наведалі факультатыўны занятак, які прайшоў у інтэрактыўнай форме для навучэнцаў 8 класа «Абагульненне ведаў па тэме “Растворы”». А затым самі былі актыўнымі удзельнікамі семінара па распрацоўцы урока па хіміі, арганізаванага ў форме інтэрактыўнага трэнінга і пазакласнага мерапрыемства - межпрадметнага эрудзіцыена, які праходзіў у форме гульні.

Гэтае мерапрыемства дало магчымасць убачыць практычнае прымяненне выкарыстання метадаў і прыёмаў інтэрактыўнага навучання, якое развівае ўменні аналізаваць, параўноўваць, выдзяляць галоўнае ў гульнявой і нязмушанай форме.

Бясспрэчна, што сёння прыйшоў час, калі неабходна выкарыстоўваць інтэрактыўныя тэхналогіі ў працэсе адукацыі кожнаму педагогу для дасягнення найбольш высокіх вынікаў, бо пры гэтым адбываецца значнае павышэнне матывацыі асобы вучня, развіцце яго творчага мыслення і эфектыўнасць засваення матэрыялу.

Алена Сеген, метадыст
упраўлення вучэбна-метадычнай работы
ДУА “Акадэмія паслядыпломнай адукацыі”










РЯД ЭЛЕКТРООТРИЦАТЕЛЬНОСТИ НЕМЕТАЛЛОВ


РЯД ЭЛЕКТРООТРИЦАТЕЛЬНОСТИ НЕМЕТАЛЛОВ

